УДК 94(476)“1941/1945”:069:351.853

# Дзейнасць Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны (1966–1991 гг.)

**Пастэрнак Г.М.**
***Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава», Віцебск***

*Адзінай у БССР грамадскай арганізацыяй, якая актыўна пачала займацца пытаннямі па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны, было Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК).*

*Мэта артыкула – правесці аналіз працы БДТАПГіК па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны на аснове вывучэння дакументальнага матэрыялу, які захоўваецца ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь.*

***Матэрыял і метады.*** *Даследаванне падрыхтавана на падставе архіўных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, перыядычнага друку і матэрыялаў, якія выдаваліся Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры. Выкарыстоўваліся гісторыка-апісальны, гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *Звяртаецца ўвага на асноўныя формы працы БДТАПГіК па увекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны: агляды і конкурсы; месячнікі і тыдні па добраўпарадкаванні помнікаў; фінансаванне работ па замене, рэканструкцыі, рамонце помнікаў і памятных месцаў баявой славы савецкага народа; выяўленне невядомых месцаў пахаванняў загінуўшых воінаў і партызан у час Вялікай Айчыннай вайны і ўсталяванне іх імёнаў; асвятленне помнікаў баявой славы савецкага народа ў друку, на радыё і тэлебачанні.*

***Заключэнне.*** *Падкрэсліваецца, што дзейнасць па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны была найважнейшым напрамкам працы Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры.*

***Ключавыя словы:*** *Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, помнікі гісторыі і культуры, увекавечанне, падзеі і героі Вялікай Айчыннай вайны.*

*(Ученые записки. – 2015. – Том 19. – С. 65–69)*

# Activity of Belarusian Voluntary Society on Preservation of Monuments of History and Culture on Commemorating Events and Heroes of Great Patriotic War (1966–1991)

**Pasternak G.M.**
***Educational establishment «Vitebsk State University named after P.M. Masherov», Vitebsk***

*The only public organization in BSSR, which was actively involved in commemorating events and heroes of the Great Patriotic War, was Belarusian Voluntary Society on Preservation of Monuments of History and Culture (BVSPMHC).*

*The purpose of the article is to analyze work of BVSPMHC on commemorating events and heroes of the Great Patriotic War on the basis of studying documents kept at State archives of the Republic of Belarus.*

***Material and methods.*** *The study is prepared on the basis of archive materials from National Historical Archive of Brest Region, State Archive of Gomel Region, State Archive of Grodno Region, periodicals and materials published by BVSPMHC. Historical and descriptive, historical and genetic as well as historical and comparative methods were used.*

***Findings and their discussion.*** *Attention is paid to basic forms of work of BVSPMHC on commemorating events and heroes of the Great Patriotic War: presentations and contests; months and weeks of refurbishment of monuments; financing replacement, reconstruction of monuments and combat glory sites of the Soviet people; identifying unknown burial places of soldiers and partisans during the Great Patriotic War as well as identification of their names; publications about monuments of combat glory, radio and TV programs.*

***Conclusion.*** *It is concluded that activity on commemorating events and heroes of the Great Patriotic War was the main direction of work by BVSPMHC.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* shishkova_nysha@mail.ru – **Г.М. Пастэрнак**

***Key words:*** *Belarusian Voluntary Society on Preservation of Monuments of History and Culture (BVSPMHC), commemoration, events and heroes of the Great Patriotic War.*

*(Scientific notes. – 2015. – Vol. 19. – P. 65–69)*

Сёмая сесія першага склікання Вярхоўнага Савета БССР (3–5 ліпеня 1945 г., Мінск) прыняла Закон "Аб азнаменаванні перамогі і ўвекавечанні памяці воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны Савецкага Саюза", што, у сваю чаргу, паклала пачатак працы па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны. Усе гаркамы і райкамы партыі сумесна з савецкімі органамі прымалі пастановы аб афармленні і добраўпарадкаванні брацкіх магіл, аб увекавечанні памяці воінаў Савецкай Арміі і партызан іншымі сродкамі. Адзінай у БССР грамадскай арганізацыяй, якая актыўна пачала займацца такімі пытаннямі, было Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (БДТАПГіК).

Мэта – правесці аналіз працы БДТАПГіК (далей Таварыства) па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны на аснове вывучэння дакументальнага матэрыялу, які захоўваецца ў дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне падрыхтавана на падставе архіўных матэрыялаў з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, Дзяржаўнага архіва Гродзенскай вобласці, перыядычнага друку і матэрыялаў, якія выдаваліся Беларускім добраахвотным таварыствам аховы помнікаў гісторыі і культуры. У працы выкарыстоўваліся гісторыка-апісальны, гісторыка-генетычны і гісторыка-параўнальны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У адпаведнасці з пастановай ЦК КПБ і Савета Міністраў Беларускай ССР у снежні 1966 г. было створана Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое аказвала непасрэднае садзейнічанне дзяржаўным органам у захаванні гістарычнай спадчыны і ў далейшым увекавечанні памятных і знамянальных падзей, імёнаў герояў вайны. З гэтай мэтай выкарыстоўваліся разнастайныя формы прыцягнення грамадскасці да выяўлення, вывучэння, уліку, захавання і выкарыстання помнікаў: агляды і конкурсы; месячнікі і тыдні па добраўпарадкаванні помнікаў; фінансаванне работ па замене, рэканструкцыі, рамонце помнікаў і памятных месцаў баявой славы савецкага народа [1, с. 22]. Неабходна адзначыць, што асабліва шырока і актыўна гэтая праца праводзілася напярэдадні знамянальных і памятных дат.

Трэба сказаць пра значны ўклад Таварыства ў фінансаванне работ па рэстаўрацыі, рэканструкцыі, замене і добраўпарадкаванні помнікаў гісторыі і культуры. У перыяд з 1970 па 1986 г. на гэтыя мэты было выдзелена больш за 7 млн рублёў. Значная колькасць помнікаў была збудавана і перабудавана пры долевым удзеле БДТАПГіК. Напрыклад, са сродкаў Брэсцкага абласнога савета 7992 рублі было затрачана на манументальны помнік гераічнага кулямётнага разліку ў вёсцы Каменюкі Камянецкага раёна; 6792 рублі – на манументальны помнік на месцы спаленай вёскі Боркі Маларыцкага раёна. На стварэнне алеі памяці Герояў пры Пружанскай СШ № 1 і абеліск на пахаванні 50 тысяч мірных жыхароў – ахвяр фашызму ва ўрочышчы Бронная Гара Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці са сродкаў раённых і гарадскіх аддзяленняў было затрачана 5081 рубель і 2000 рублёў адпаведна [2, арк. 14].

Значную працу праводзілі ў перыяд штогадовых вясновых (красавік–май) месячнікаў, падчас якіх праводзілі замену помнікаў, зробленых з нетрывалых матэрыялаў і на нізкім мастацкім узроўні. Так, па Гомельскай вобласці за перыяд месячніка ў 1973 годзе быў арганізаваны неабходны бягучы рамонт 20 помнікаў, у 1975 годзе – зноў пабудаваны і ўстаноўлены: 3 манументы, у тым ліку манумент дружбы народаў на мяжы трох брацкіх рэспублік – РСФСР, УССР, БССР, 5 скульптурных помнікаў, 18 абеліскаў, 27 мемарыяльных дошак, 6 помнікаў ахвярам фашызму – мірным жыхарам [3, арк. 22; 4, арк. 18]. Па выніках красавіка–мая 1974 года ў Брэсцкай вобласці шляхам капітальнага і бягучага рамонту было прыведзена ў парадак 518 памятных знакаў, заменена 11 помнікаў, выкананых на недастатковым мастацкім узроўні, у

1980 годзе – 11 помнікам быў зроблены капітальны рамонт і 452 бягучы [5, арк. 15; 6, арк. 19]. У 1974 годзе, напярэдадні святкавання 30-годдзя вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, пры ўдзеле мясцовых саветаў Таварыства ў рэспубліцы было ўпарадкавана 3906 месцаў пахаванняў, адрамантавана больш за 400 і збудавана 20 новых помнікаў на магілах воінаў Савецкай Арміі і партызан [7, с. 34].

З 1983 г. праводзіўся рэспубліканскі грамадскі агляд добраўпарадкавання памятных месцаў і помнікаў баявой і працоўнай славы савецкага народа. Толькі за наступныя два гады з выдаткаваных сродкаў Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры ў памеры 373,2 тысячы рублёў было збудавана, рэканструявана і заменена 435 памятных знакаў і абеліскаў, устаноўлена 156 мемарыяльных дошак [1, с. 23].

Імкненне грамадскасці больш ведаць пра людзей, чыімі імёнамі названы вуліцы, плошчы, бульвары і паркі, беражлівыя адносіны да рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый прадыктавалі яшчэ адну форму працы, якая мела вялікае выхаваўчае значэнне, – свята вуліц. Напярэдадні, як правіла, праводзілася вялікая пошукавая праца, дзякуючы якой вывучаліся жыццё і дзейнасць герояў, чые імёны насілі вуліцы. Найбольш актыўна і шырока падобныя святы жыхароў вуліц (вул. Перамогі, вул. імя Ракасоўскага, імя Братоў Лізюковых) адбываліся ў г. Гомелі. Падчас мерапрыемстваў выступалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, прадстаўнікі партыйных і камсамольскіх арганізацый, ускладаліся кветкі ля мемарыяльных дошак, выступалі калектывы мастацкай самадзейнасці, праходзілі святочныя шэсці па вуліцах і спартыўныя спаборніцтвы [4, арк. 14]. Падобныя святы не толькі абуджалі цікавасць да гісторыі горада, але і спрыялі добраўпарадкаванню вуліц і развіццю грамадскай ініцыятывы.

Абласныя аддзяленні БДТАПГіК сумесна з мясцовымі органамі савецкай улады, ваенкаматамі, камсамолам, пошукавымі атрадамі навучальных устаноў і працоўных калектываў праводзілі шматбаковую працу па выяўленні невядомых месцаў пахаванняў загінуўшых воінаў і партызан у час Вялікай Айчыннай вайны і ўсталяванні іх імёнаў. Яскравым прыкладам у гэтым напрамку з’яўляецца дзейнасць Гомельскага абласнога аддзялення. Яна была распачата ў 1975 годзе з выяўлення месцаў пахавання каля 170 раней невядомых загінуўшых воінаў, партызан і падпольшчыкаў, 6 новых пахаванняў, у якіх знаходзяцца астанкі каля 100 воінаў, партызан і падпольшчыкаў [3, арк. 26]. Кожны год усталёўваліся прозвішчы раней невядомых воінаў, пахаваных на Гомельскай зямлі. У 1986 г. выявілі 258 такіх прозвішчаў, у 1987 – 162, у 1988 – 114 [8, арк. 14]. У выніку праведзенай работы да 1989 года ў вобласці амаль скончылі занясенне на абеліскі і мемарыяльныя пліты прозвішчаў вядомых воінаў Савецкай Арміі, партызан і падпольшчыкаў, пахаваных у брацкіх і адзіночных магілах. Калі ў 1986 годзе не было занесена на абеліскі і мемарыяльныя пліты больш за 28 тыс. прозвішчаў вядомых воінаў, то на 1 мая 1989 года засталося ўсяго занесці 2826 вядомых прозвішчаў [8, арк. 14].

Ва ўсіх гарадскіх і раённых аддзяленнях Таварыства сумесна з органамі Міністэрства культуры БССР і саветамі ветэранаў вайны праводзіліся сустрэчы і тэматычныя вечары. У гомельскім Кастрычніцкім райаддзяленні Таварыства правялі больш за 20 падобных сустрэч і вечароў: “Подвиг отцов в наследие сыновьям”, “Они сражались за Родину”, “Их имена овеяны славой” і інш. [4, арк. 13]. Тэматычныя вечары і сустрэчы з удзельнікамі вызвалення БССР і Гродзеншчыны, ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны абласное аддзяленне Гродзенскай вобласці арганізоўвала непасрэдна для выпускнікоў 8–10 класаў васьмігадовых і сярэдніх школ вобласці, а для навучэнцаў 6–7 класаў сярэдніх школ Ленінскага раёна – цыкл вечароў “Никто не забыт, ничто не забыто” [9, арк. 8–9].

Удасканальвалася праца па стварэнні лектарскіх груп па прапагандзе ведаў аб помніках і наладжванні рэгулярнага чытання лекцый і дакладаў на ваенна-патрыятычныя тэмы [10, арк. 1, 3, 7]. Так, за 1974 г. лектарамі рэспубліканскіх, абласных, гарадскіх і раённых бюро прапаганды ведаў аб помніках гісторыі і культуры было прачытана 19718 лекцый [11, арк. 3]. Больш за 70% усіх лекцый – па спецыяльна распрацаванай тэматыцы, якая ўключала ў сябе наступныя тэмы: “Помнікі і памятныя мясціны Беларускай аперацыі”, “Помнікі вайсковай славы савецкага народа”, “Героі Савецкага Саюза – нашы землякі”, “Партызанскі рух у Беларусі: помнікі і

памятныя месцы”, “Камуністычнае падполле Беларусі ў помніках і манументах”, “Помнікі ахвярам фашызму на тэрыторыі Беларусі”, “Нашы землякі – героі вызвалення Беларусі”, “Перамога савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне” і інш. [11, арк. 4–5]. Напярэдадні 40-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне лектары БДТАПГіК выступілі ў час правядзення 153 лекторыяў, 105 кіналекторыяў і прачыталі 51 цыкл лекцый па тэматыцы “Нягаснучы подзвіг народа” і “Навечна ў памяці народнай” [1, с. 25].

Значная ўвага надавалася і друкаванай прапагандзе. Па лініі Таварыства распрацоўваліся і накіроўваліся ў раёны метадычныя распрацоўкі, навукова-метадычныя і даведачныя матэрыялы аб помніках гісторыі і культуры. Выдаваліся даведнікі і фотаальбомы аб мемарыяльных комплексах, буклеты аб Героях Савецкага Саюза, брашуры аб удзельніках партызанскага руху і камуністычнага падполля (за 1981–1984 гг. выпушчана ў свет больш за 150 такіх матэрыялаў) [10, арк. 5, 7; 12, с. 27]. Непасрэдна раённымі і гарадскімі аддзяленнямі Таварыства выдаваліся плакаты, лістоўкі, буклеты: “Зыслаў – востраў партызанскі” (г. Любань); “Слутчина помнит своих освободителей”, “Минщина помнит” (Мінскі раён); “Они сражались за Родину” (Смалявіцкі раён); “Жывым і мёртвым нескароным удзячнай памяці вякі!” (Шаркаўшчынскі раён); “Ничто не забыто, никто не забыт” (Глыбоцкі раён) і інш. [11, арк. 5].

Шмат увагі надавалася асвятленню помнікаў баявой славы савецкага народа ў друку, на радыё і тэлебачанні. З 1970 года штоквартальна выдаваўся інфармацыйны навукова-метадычны бюлетэнь БДТАПГіК “Помнікі гісторыі і культуры Беларусі”, дзе рэгулярна размяшчаліся артыкулы, нарысы, інфармацыя пра помнікі баявой славы і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. На старонках брэсцкай абласной газеты “Заря” ў 1973 годзе з’явілася 15 асобных рубрык, прысвечаных перыяду Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. [5, арк. 6–7]. На радыё і тэлебачанні раз у месяц рыхтавалі выступы з мэтай выхавання пачуццяў гонару за сваю Радзіму, павагі да годных старонак мінулага сваёй краіны, за свой народ, за яго вялікія здзяйсненні [11, арк. 6]. У перыяд падрыхтоўкі да 30-годдзя Перамогі абласная газета “Гомельская правда” і ўсе раённыя газеты Гомельшчыны рэгулярна змяшчалі на сваіх старонках матэрыялы пад рубрыкай “Памятники рассказывают” [3, арк. 29]. Тэматычныя перадачы, прысвечаныя вызваленню БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, былі падрыхтаваны і праведзены ў г. Баранавічы: “Их именами названы улицы”, “В памяти народной”, “Герои Советского Союза – наши земляки” [5, арк. 8]. Амаль што ва ўсіх раённых газетах Гродзенскай вобласці да 40-годдзя вызвалення БССР была размешчана рубрыка “Подвиг”. На абласным тэлебачанні паказалі сем тэлеперадач альманаха “Наследие”, а на абласным і раённым радыёвяшчанні арганізавалі 114 радыёперадач [12, арк. 169].

Важная роля ў распаўсюджванні ведаў пра помнікі гісторыі і культуры належала навукова-практычным канферэнцыям, непасрэдны удзел у арганізацыі якіх прымала Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Трыццацігоддзю вызвалення БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў была прысвечана рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя “Использование памятников истории и культуры в коммунистическом воспитании трудящихся”, што праходзіла ў г. Гомелі. У прынятых на ёй рэкамендацыях ішла гаворка пра неабходнасць больш актыўнага выкарыстання ў выхаваўчай працы звестак пра помнікі рэвалюцыйнага мінулага, працоўнай славы, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў [1, с. 25]. У верасні 1975 года ў Брэсце і Мінску праходзіла міжнародная навуковая канферэнцыя “Памятники борьбы и победы”. У яе рабоце прынялі ўдзел вядомыя навукоўцы-мастацтвазнаўцы, мастакі, скульптары, архітэктары з Савецкага Саюза, ГДР, Польшчы, Балгарыі, Румыніі, Венгрыі, Чэхаславакіі, Манголіі. У заслуханых дакладах быў абагульнены вопыт стварэння помнікаў у сацыялістычных краінах, зроблены глыбокі аналіз развіцця манументальнай прапаганды [1, с. 26]. А да 40-годдзя вызвалення БССР сумесна з кафедрай гісторыі БССР Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта і кафедрай гісторыі КПСС Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута ў г. Гродна і г. Ліда былі праведзены навукова-практычныя канферэнцыі на тэму “Памятники Великой Отечественной войны в Белоруссии и на Гродненщине и их роль

в коммунистическом воспитании молодежи” [9, арк. 8].

**Заключэнне.** Такім чынам, дзякуючы намаганням Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры была адрамантавана, добраўпарадкавана, рэстаўравана і заменена значная колькасць помнікаў і памятных месцаў баявой славы. Праводзілася праца па стварэнні лектарскіх груп па прапагандзе ведаў аб помніках і наладжванні рэгулярнага чытання лекцый і дакладаў на ваенна-патрыятычныя тэмы. Членамі Таварыства праводзілася шматбаковая праца па выяўленні невядомых месцаў пахаванняў загінуўшых воінаў і партызан у час Вялікай Айчыннай вайны і ўсталяванні іх імёнаў. Пры падтрымцы БДТАПГіК былі выдадзены тэматычныя плакаты, лістоўкі і буклеты. Дзейнасць па ўвекавечанні памяці аб падзеях і героях Вялікай Айчыннай вайны была найважнейшым напрамкам працы Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое ўнесла важкі ўклад у ажыццяўленне дзяржаўнай палітыкі па дастойным ушанаванні герояў і ахвяр вайны.

## Літаратура


1. Ракашевич, В.К. В памяти и сердце народа / В.К. Ракашевич; Респ. совет Белорус. добр. о-ва охраны памятников истории и культуры. – Минск: Полымя, 1986. – 36 с.
2. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 155. – Воп. 1. – Спр. 84: Годовой отчет областного отделения Общества охраны памятников истории и культуры за 1975 год.
3. Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 727. – Воп. 1. – Спр. 25: Отчеты, справки о работе областного и районных советов Общества за 1975 год.
4. ДАГВ. – Ф. 727. – Воп. 1. – Спр. 19: Отчеты о работе областного и районных советов Общества охраны памятников истории и культуры за 1973 год.
5. ДАБВ. – Ф. 155. – Воп. 1. – Спр. 62: Отчет о работе областного отделения Общества охраны памятников истории и культуры за 1973 год.
6. ДАБВ. – Ф. 155. – Воп. 1. – Спр. 142: Отчет о работе областного отделения за 1980 год.
7. Историческое краеведение Белоруссии: учеб. пособие для исторических факультетов вузов республики; под ред. Э.М. Загорульского. – Минск: Изд. БГУ им. В.И. Ленина, 1980. – 263 с.
8. ДАГВ. – Ф. 727. – Воп. 1. – Спр. 53: Информации о работе Гомельского областного отделения Общества за 1989–1990 гг.
9. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГрВ). – Ф. 224. – Воп. 1. – Спр. 143: Документы об итогах общественного смотра памятников истории и культуры, посвященного 40-летию освобождения БССР (информации, списки и др.) за 1984 год.
10. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 492. – Воп. 2. – Спр. 8: Планы работы республиканского и областных бюро на 1974 год.
11. НАРБ. – Ф. 492. – Воп. 2. – Спр. 11: Отчеты республиканского и областных бюро о работе за 1974 год.
12. ДАГрВ. – Ф. 224. – Воп. 1. – Спр. 69: Документы о работе молодежной секции (протоколы, справки и др.) за 1975–1987 года.


*Паступіў у рэдакцыю 30.04.2015 г.*